ПОЛЫМЯ

БЕЛАРУСКАЯ ЧАСОПІСЬ ЛІТАРАТУРЫ,
ПОЛІТЫКІ, ЭКОНОМІКІ, ГІСТОРЫІ



№ 1

1928

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва
МЕНСК — 1928

1-ая друкарня Беларускага
Дзяржаўнага Выдавецтва
Галоўлітбел № 529
У ліку 1.500 экз.
Заказ № 130.

ДРАПЕЖНІКІ

Роман у трох частках

Я. Нёманскі

Частка першая

І

— Салавейчык, га Салавейчык! Вязеце мяне, калі ласка, ня вуліцаю, а сьценкаю паўз сяло. Ведаеце?

— Добра!

Балагола зьвярнуў у бок і закульгаў па вузкай дарожцы, якая істужкаю працягнулася ўздоўж вёскі. Тодар Крэпчук вылез з буды і прымасьціўся на салавейчыкавым мяшку. Вось гэтыя гумны, пастаўленыя ў рад, як салдаты на вучэньні, вось вузенькія палоскі гародаў, над якімі матляюцца для пужаньня вераб'ёў старыя кашулі і спадніцы, а вось з другога боку сьценкі-загончыкі закаласіўшага жыта і яскрава зялёнае, нізкае яшчэ ярыны. Вось кабета адарвалася ад грады, прылажыла далонь да ілба і ўглядаецца, хто едзе.

— Бэрка, каго ты вязеш?—голасна пытаецца яна.

— Вусы вырастуць, калі ўсё будзеш ведаць!—адказвае хурман і падсьцёбвае запараную кабылку.

На Тодара зразу налятае вяласьць. Калі ад самае чыгункі, усе дваццаць вёрст ён неадчэпна падганяў Салавейчыка, раз-по-разу высоўваўся з буды, каб сачыць за вярстовымі слупамі, прыкмячаў усе ўзгоркі, лясы, гаёчкі, рэчкі, то цяпер, калі ён быў блізка ад дому, цікавасьць і нецярплівасьць раптам прапалі. Можа гэта залежыць ад таго, што калі едзеш куды, то думкі малююць перад табою нешта новае, нязвычайнае, што чакае цябе ўперадзе; і вось, як, замест гэтага нязвычайнага, убачыш тое, да чаго даўно прывучана вока і пачуцьцё, то мусіць быць рэакцыя супроць прыпаднятасьці настрою.

Тодар акінуў вокам роўны шэраг гумен, гароды з роўненькімі градамі, шэраг калодезных жураўлёў і далей, у канцы вёскі, вежу царквы і аддаўся задуменнасьці, якая ня мела ніякага зьвязку з уражаньнямі ад роднага сяла.

— Ну, вось і прыехалі!

Тодар уздрыгнуў ад гэтых слоў. Ён ускінуў свой бляды твар, рэзка павярнуўся ў бок школы, перад якою стаяў балагола. У яго стомленых вачох заблішчэў вагоньчык радасьці, на твары зьявіліся невя-

лічкія ружовыя плямкі. Рука крыху дрыжэла, калі ён абапёрся ёю на аглабіну злазячы з возу.

Тодар жвава саскочыў з возу і ў момант быў на ганку. Крыху прыпыніўшыся, ён узяўся за клямку. Дзьверы не адчыняліся. Ён мацней націснуў на клямку і грукнуў каленам у дзьверы. Нічога не пасобіла. Што-б гэта азначала?

— Выкіньце, Салавейчык, маю пляцёнку ды будзьце вольны,— зьвярнуўся апаўшым голасам Тодар да балаголы.

Расплаціўшыся, Тодар падняў сваю пляцёнку і пайшоў да брамкі, праз якую можна было папасьці на двор, а адтуль „чорным ходам"—у кватэру. Але і брамка была замкнута. Ня доўга думаючы, Тодар перакінуў свае клункі цераз плот, а потым і сам пералез. Пакінуўшы ўсё сваё дабро ляжаць на зямлі, ён кінуўся да „чорных" дзьвярэй, і так быў упэўнены, што яны не замкнуты, што нават зьнячэўку трахнуўся аб іх ілбом.

„Што гэта здарылася?"

Школа стаяла ў адлегласьці ад вёскі, а таксама і ўсіх тых будынкаў, што звычайна бываюць на „дзядзінцы". Такім чынам, у гэты час нават ня было паблізку нікога, у каго-б можна было запытаць аб сваіх, дзе яны. Дый пытацца неяк няскладна.

Пастаяўшы каля чорнага ганку, пакуль ад'едзе балагола, Тодар пайшоў аглядаць школьны пляц—так сабе, не ад цікавасьці, а каб скаратаць час. Вось грады з малінамі, трускаўкамі, вось шпалеры кустоў агрэсту, далей сад з роўнымі востраверхімі ялінамі вакол, паўз плот. Бацька Тодара сьвядомы ня толькі настаўнік, адзе і садавод, і сад каля школы заўсёды трымаўся ў належным парадку. Толькі цяпер ён выглядаў не такім чыстым, якім ведаў яго Тодар раней. На дрэвах лушчылася пажоўклая вапна, дзе-ні-дзе ўбачыш чортапалох або лопух, дарожкі былі засыпаны пажоўклаю апаўшаю цьвіценьню. Мімаволі зьвязваліся ў думках замкнутыя дзьверы і гэтая неахайнасьць саду.

З панураю галавою перанёс Тодар свой багаж да чорнага ганку і зноў пайшоў сланяцца па садзе. Ён хадзіў узад і ўперад, як маятнік, падоўга стаяў на месцы і са ўзгорку глядзеў на маёнтак, за ім на рэчку і лес, але ўсё гэта не магло прыцягнуць яго ўвагі і зьмяніць той нудны настрой, які апанаваў яго каля замкнутых дзьвярэй.

Вылаяўшы ў сэрцы пчол і розную мошку, якая ў нярухомай цішы яснага сонечнага дня бясконца цягнула свой монотонны звон, Тодар раптам скінуў сваю студэнцкую жукетку, сьцепануў яе ад пылу і, кінуўшы на траву, лёг пад дрэва. Ён дастаў нейкую невялікую кніжку з кішэні.

„Дзеля гэтага ня варта было ехаць з Пецярбургу—можна было-б і ў Лясным так час правесьці", падумаў, пачынаючы чытаць, Тодар.

— Ха-ха-ха!—срэбраным званком будзіць Тодара чыйсьці голас.

Тодар адганяе муху з свайго твару, якая непакоіла яго, адкрывае вочы. Маладая дзяўчына з травінкаю ў руцэ, якую яна раптам адхіліла

ад твару Тодара, крыху адскочыла ў бок і з вясёлымі вагоньчыкамі ў вачох глядзела на яго. Тодар сеў і недаўменна зірнуў на дзяўчыну.

— Ты ўжо ачнуўся, ці не? Чаго ты так глядзіш?—і звонкі сьмех рассыпаўся па зелені саду, прасякнутага косымі праменьнямі сонца.

— Пачакай!.. Да гэта ты, Зоська?

— Вось табе і на! Не пазнаў зразу?

Тодар ускочыў на ногі і кінуўся да сястры. Яна са сьмехам пусьцілася па садзе, пераскакваючы праз кусты, грады, хаваючыся за тоўстыя дрэвы. Белы капялюшык яе зваліўся з галавы, каса расплялася і лёгкая хваля залатых валасоў насілася з аднаго ў другі канец саду.

— Ну, здагані!—паддражнівала яна брата і з гэтымі словамі была ўжо ў густым малiньнiку.

Так мусіць з поўгадзіны яны, як маленькія дзеці, гойсалі па ўсяму садоваму пляцу. Нават на блядым, стомленым твары Тодара зьявілася ружовая фарба.

— Ну, кінь ты!—напасьледак сказаў ён.—Я даўно ўжо ня лётаў так і не магу ўганяцца за табою. Ідзі да мяне!

Зося выскачыла з-за кустоў і павісла на шыі брата.

— Якая ты вялікая ўжо стала! Мне здавалася, што ты такая худзенькая, мізэрная дзяўчынка з чорным хвартушком на сінім убраньні. А ты вось якая.

Ён з замілаваньнем гладзіў растрапаныя косы сястры, углядаўся ў яе вясёлы жвавы твар, шэрыя вочы, з якіх нібы скакалі іскры.

— Ты быў дома зімою два гады назад. Помніш, ты не хацеў узяць мяне ў лес, як ішоў туды са стрэльбаю.

— Тады ты была дзяўчынка, а цяпер... кабета.

— Я і цяпер такая! Мне так хочацца, часам, паскакаць, падурэць, як цяпер! Толькі сорамна чужых. А вось з табою мне ня брыдка... Ды калі ты прыехаў?

Тодар паглядзеў на сонца, якое было на адвячорку, і сам падзівіўся, што так многа праспаў. Запытаньне сястры вярнула яго да таго настрою, які адчуваў ён раніцою, калі прыехаў да дому.

— Што ты такі хмурны зрабіўся?—запытала Зося.

— Так... Скажы мне, дзе ты была цэлы дзень і чаму школа замкнута са ўсіх бакоў?

— Татку вызвалі па нейкіх справах у горад, а я цяпер на службе.

Брат зьдзіўлена паглядзеў на дзяўчыну. Яна на службе, такое яшчэ, можна лічыць, дзіцянё? Дый дзе-ж тут можна служыць? Хіба настаўніцаю ў суседняй вёсцы, але-ж у гэты час ня можа быць заняткаў. Гэтыя думкі прамільгнулі ў галаве Тодара і не далі адказу на запытаньні, якія ўзьніклі пры паведамленьні Зосі.

— Я служу на заводзе!—І Зося сур'ёзна паглядзела на брата.

— На якім заводзе? Што за плёткі?

— Ды ці-ж ты нічога ня ведаеш? Няўжо-ж мы ня пісалі табе? Ідзі, глянь!

З гэтымі словамі Зося схапіла брата за руку і пацягнула за сабою ў рог саду на ўзгорак, адкуль адкрываўся шырокі кругавід.

— Вось, глядзі туды!

За маёнткам Ляскаўцамі, які хаваўся ў купах ліп вялізарнага парку і знаходзіўся каля самага гасьцінца, ніжэй к рэчцы ўздымаліся ў неба два вялізарныя коміны. Вакол іх раскіданы былі чырвоныя муры і белыя новенькія драўляныя будынкі. Дахі і новыя сьцены блішчэлі на сонцы і рэзка выдзяляліся на фоне сьветла-зялёных сенажацяў і больш цёмнае істужкі дальнага лесу. З таго боку рэчкі, якраз супроць новых будынкаў, па сенажаці разаслаўся роўны, як страла, шырачэзны роў, які ўпіраўся далёкім канцом у самы лес, хаваючыся там. Каля завадзкіх будынкаў, як мурашкі, поўзалі людзі, відаць былі запрэжаныя хурманкі, якія паважняком выяжджалі на вольнае месца. На рэчцы, супроць заводу, віліся ўверх сінія палоскі дыму з прытарнаваных плытоў.

— Ну, бачыш! Шкляны завод ужо пабудаваны і скончаны. Цяпер канчаюць папяровую фабрыку. Вось я і служу ў канторы шклянога заводу, ужо два тыдні.

Тодар ня мог пазбавіцца ад зьдзіўленьня. Яго ня толькі дзівіла тое, што ў гэтым глухім месцы ўзьніклі два заводы, а і тое, што яго сястрычка, учора яшчэ дзіцё, ужо пайшла самастойнаю дарогаю.

— І табе ня боязна там служыць?

— Не! Чаго-ж мне баяцца?

— Маладзец ты ў мяне! Трэба згадзіцца, што ты дарослая.

— Кінь ты дзівіцца з мяне! Хадзем лепш у хату.

Тодар сабраў свае клумкі і сьледам за сястрою ўвайшоў у школу. З дзяцінства знаёмыя малюнкі абступілі яго. Па сьценах таксама былі разьвешаны дзьве географічныя парыжэлыя мапы, карткі зьвяроў і расьлін, карткі сьвятых, абраз на куце, крывая шафа з „Родным Словом", „Житіями Святых", „Часословом", „Псалтирями" ды іншымі „назидательными и душеспасительными" кніжкамі ў замурзаных вокладках. На ўсіх рэчах ляжаў тлусты пыл і павуціна. Усё тое самае, ніводнае рыскі, ніводнае падрабязнасьці, якая-б сьведчыла аб зьменах у параўнаньні з мінулым. Як было пятнаццаць год назад, так і засталося, колькі-б раз ні прыходзілася аглядаць школу з новым прыездам. Можа не пятнаццаць год ня было зьмен, а і ўсе сорак, як існуе самая школа. Таксама і ў бацькавай кватэры ўсё на тым-жа месцы, усё тыя-ж старыя зэдлікі і крэслы, канапы з даўно страціўшаю фарбу абіўкаю, столікі, пакрытыя сьцертаю цыратаю. Вось і шафа з уласнымі бацькаўскімі кніжкамі: Ранке, Гельмгольц, Гааке, Карэев, клясыкі расійскай літаратуры. Ня відаць тут кніжок, якія былі тры-чатыры гады назад: у 1905 годзе ў гэтай самай шафе побач з Карамзіным стаяў Шышкоў, між бібліяй і гісторыяй царквы ўціскаўся Рубакін, а на сподняй паліцы каля „Губернских Ведомостей" ляжаў стажок „Нашай Нівы". Засталіся толькі старыя пажоўклыя сшыткі ў цяжкіх вокладках, быццам яны, як струхлеўшыя дзяды, не маглі сыйсьці з месца; моладзь-жа кудысь дзелася. Але яна, мусіць, не пайшла шукаць прыстанішча па сьвеце, а марнее, захованая ад сонца і чалавечых вачэй.

— Што ты разглядаеш у гэтай шафе?—высунуўшы галаў з другога пакою, запыталася Зося.—Яна ўсё такая самая і ў ёй усё тое самае.

— Ня зусім так!—з развагаю адказаў Тодар.

Запушчанасьць у садзе, неахайнасьць у школе, псалтыры і „житія святых", як бросьнямі, абляпілі істоту Тодара. Увесь той жыцьцярады настрой, які адчуваў ён пры спатканьні з сястрою, прапаў. Вялымі крокамі пайшоў ён у другую каморку, куды клікала яго Зося палуднаваць.

— А дзеля чаго паехаў татка ў горад?—запытаўся за сталом Тодар.

— Ён сказаў, што па школьных справах—дні на тры. А па якіх справах—я ня ведаю: нічога не сказаў.

— І часта ён езьдзіць да гораду?

— Амаль штомесяц, каля гэтага тэрміну.

— Штомесяц? Па школьных справах?

— Чаму гэта цябе так дзівіць? Ён так кажа.

Гэтыя рэгулёвыя штомесячныя наведваньні бацькам павятовага гораду занепакоілі Тодара. Няўжо-ж яшчэ да гэтага часу?.. Два гады назад яго бацьку, Пятрусю Крэпчуку, загадалі наведвацца ў павет па „школьных справах". Ці не такія самыя справы цяпер, як і тады? Тады бадай палову мужчын сяла Ляскоўцы цягалі ў павет. Даведваліся, хто падбіваў сялян на мяцеж улетку 1905 году, хто падпальваў панскія адрыны, хто ўдзельнічаў у зьнішчэньні хвальварку Закрошын. Шмат каго з сялян пасадзілі, і сядзелі яны гадамі, як гэта было ведама Тодару яшчэ ў Пецярбурзе. Раз увосень зьявіўся ў школу ураднік і загадаў бацьку ехаць да спраўніка ў павет. Тады яго пратрымалі з тыдзень ды пусьцілі, але пачаліся наведваньні па „школьных справах".

— А благачынны часта бывае ў нас у школе?

Зося не зразумела адразу, дзеля чаго гэтае запытаньне.

— Благачынны?.. Часта, так... праз два тыдні зімою... Што табе ўзбрыў у галаў благачынны?

— Так сабе... Як пападзеш дадому, дык усялякая драбяза ўспамінаецца і цікавіць.

Так, мусіць да гэтага часу бацьку надта шмат непакояць „школьныя справы". Раздумляючыся над гэтым, Тодар забыўся есьці і нярухомым поглядам уставіўся ў далячыню сенажацяй, якія, як на далоні, відаць былі з вакна...

— Дый што-ж ты, Тодзенька, засмучаны такі? Вось я табе...

З гэтымі словамі Зося, як кошка, падскочыла, абхапіла брата за шыю.

— Эй, нясі мяне, як тады ўлетку пераносіў цераз рэчку! Помніш, калі мы хадзілі за грыбамі.

— Ах, ты жанчына! Дарослая! Ну, трымайся!

Тодар пад хохат Зосі панёсься з пакою ў пакой. Старыя дошкі падлогі затрэсьліся, шкло ў вокнах зазьвінела, нават пагрызаны мольлю Карамзін кранууся з свайго месца ў шафе і штурхануў у бок Гельмгольца. Стол уздрыгнуў, стаў на адну нагу, пастаяў момант у разважаньні і рушыўся на этажэрку, з якое зьгрукаталі адна за аднэю кніжкі.

— Ну, досыць!—і Зося кумяльганам пераляцела цераз плячо брата.

Тодар, адсопшыся, пачаў падбіраць раскіданыя кніжкі. Сярод іх трапляліся невялікія сшыткі ў далікатных вокладках з залатымі надпісамі і вышытымі закладкамі. Такія прыбраныя, як лялькі, кніжкі ўжо гэтым прыцягалі ўвагу. Мопассан, Метэрлік, Купрын... Зося пасабляла падбіраць, але, як знарок, пакідала на падлозе гэтыя зухаватыя кніжкі.

— А ведаеш, я „Саніна" чытала!—выпаліла яна, як з ружжа, і пачырванела аж да вушэй.

Тодар разагнуўся, правёў рукою па валасох і ўважліва паглядзеў на сястру. Вось табе і дарослая!

— Чытала? Ну, што-ж! Кепска толькі тое, што ты аб гэтым гаворыш з пахвальбою, усё роўна як зрабіла нейкі надзвычайна дадатны ўчынак... Адкуль ты бярэш гэтыя вось кніжкі, ад якіх нясе парфумай?—трошкі пачакаўшы, запытаўся Тодар.

— Мне дае іх панна Ляскоўская.

— Ты бываеш у паноў?

У голасе Тодара адчуўся халадок і няпрыязьнь.

— Бываю ў Ядзі Ляскоўскай—і даволі часта.

Зося была крыху зьбянтэжана тым навучальным тонам, які брат узяў, калі яна прызналася яму аб „Саніне", а таксама тэю рыскаю няпрыемнасьці, якая паказалася на яго твары пры паведамленьні аб адносінах яе з панамі Ляскоўскімі. Яна стаяла ціха, пазірала ў бок і перабірала пальцамі істужкі свайго хвартушка.

— Табе не падабаецца, што я бываю ў маёнтку?

— Зусім не падабаецца!

— Я-ж калісь з паннаю Ядзяю разам у гімназіі вучылася. Няўжо я не павінна і з ёю бачыцца?

— Павінна ты ці не—я нічога не кажу!

Тодар павярнуўся да вакна і пачаў з уважлівасьцю разглядаць вазон з фукцыяю. Відаць было па ім, што яго апанавала абурэньне, якое ён хацеў стрымаць.

— Ну, добра,—раптам павярнуўшыся, сказаў ён.—Яшчэ ў нас часу будзе шмат, каб пагаварыць аба ўсім. Прачытала Арцыбашава, ну і ліха з ім! Прачытаеш і што іншае: там у мяне цалюханька пляцёнка розных

добрых кніжок... Салавейчык, калі ўпіхаў мяне на станцыі ў сваю балаголу, дык нават запытаўся, ці ня золата ў мяне напакавана ў пляцёнцы—такая яна цяжкая.

— Давай я пасоблю табе распакоўвацца!—зноў ажывілася Зося.

Разьбіраючы рэчы брата, якія былі без парадку зложаны ў пляцёнцы, Зося некалькі разоў зьвярталася ў бок Тодара, быццам хацела яму нешта сказаць, але сутрымлівалася.

— Дык ты ня хочаш, каб я наведвалася да Ляскоўскіх?—напасьледак запыталася яна.

Тодар не пасьпеў адказаць, як яна з жвавасьцю падхапіла сваю думку, якая, мусіць, надта займала яе, і зашчабятала, як птушка раніцою:

— А ведаеш, заўтра ці пасьлязаўтра ў маёнтку будзе зборышча гасьцей. Шмат зьведзецца народу. Нават маршалак і, кажуць, губарнатар будзе. Пан Ляскоўскі склікае ня толькі паноў, але гатуе пачостку рабочым ды некаторым сялянам. Будзе баль з музыкаю.

— І рабочых і сялян склікае?

— Так.

— Што-ж гэта за фокус?

— А будуць гуту пушчаць. Я павінна буду пайсьці, як служачая,—гэта першае, а падругое—нам прышлюць запросіны. Ты павінен будзеш пайсьці, і татка пойдзе, калі прыедзе да таго часу.

— Навошта я там здаўся? Не, мне няма чаго хадзіць да пана.

— Ах, Тодарка! Там будзе столькі народу, будзе музыка з гораду, будуць танцы—так вясёла. Няўжо-ж ты ўседзіш дома? Мне дык цяпер ужо хочацца скакаць.

— Блазан ты!

— Не, ня блазан, ня блазан! Вось табе!—І Зося абедзьвюма рукамі прайшлася па густой шэвялюры брата, зрабіўшы голаў яго падобнай да капы сена.

Тодар вызваліўся ад праворных рук сястрычкі, пасадзіў яе, як малую, на канапу і пачаў хадзіць з вугла ў вугал праз увесь пакой. Стала ціха, нібы ні жывое душы ня было тут, толькі падлога мерна рыпала пад нагамі Тодара. Зося, як мышка, прытулілася ў абочыны канапы і вадзіла вачмі за братам, як, здаецца, не прыкмячаў яе прысутнасьці. Глыбокая задуменнасьць апанавала ім, губы зложыліся шчыльна і каля вуглоў іх зьявіліся рыскі горачы. Заходзячае сонца чырвоным праменем асьвятляла яго бляды твар, як толькі ён паварочваўся ў бок вакна, і рабіла яго жорсткім, чужым, далёкім.

— Тодар, ня трэба больш хадзіць!

— Га!

— Няпрыемны выгляд у цябе, злы такі. Ты раней такім ніколі ня быў.

— Праўда? Ну давай разам сядзем, я табе скажу што-кольвечы вясёлае аб тэатры, напрыклад, аб пецярбурскіх знаёмых...

Ад вакна ліўся лёгкі ружова-зялёны сьвет чэрвеньскага вечару.

Пан Станіслаў у чорным сурдуце, гладка прычэсаны, са шкельцам над адным вокам стаяў ля расчыненых насьцеж дзьвярэй прыёмнае, адкуль праз некалькі крокаў пачынаўся спуск уніз да пад'езду. Усходы былі засланы мяккаю дарагою посьцілкаю, на слупчыках балясаў па абодвух бакох усходаў былі расстаўлены цяплічныя расьліны і кветкі. Лёкаі ў расшытых, як у генэралаў, сурдутах стаялі ўнізе каля ўваходных дзьвярэй. На двары раз-по-разу чуцён быў лёгкі бразкат колаў, і сьледам за ім у дзьвярах паказваліся госьці, якіх лёкай вёў па ўсходах. Пан Станіслаў з нязьменнаю радасьцю і гасьціннасьцю на твары сустракаў кожнага і праводзіў у пакоі, перадаючы далейшы клопат аб гасьцёх маццеры і сястры Ядзі.

— Ах, пан Юзаф! Вы ўсё такі-ж здатны!

— Віншую пані Гэлену, вы цьвіцяце, як ружа!

— Цішэй, пан Станіслаў, а то мой пан Вінцусь страціць спакой з-за вас.

— Ну, як жыве рыцар чатырох краін?

— Кепска, кепска, пан Станіслаў! У чатырох краінах няма ніводнай „дамы сэрца".

З гадзіну такія прывітаньні ня сьціхалі каля дзьвярэй прыёмнае пана Станіслава. З гасьціннае і іншых пакояў нёсься гоман, вясёлы рогат. Лёкаі ўжо нікога не сустракалі і праводзілі ўверх, але пан Станіслаў стаяў і з застыўшаю мінаю гасьціннасьці чакаў. Ужо сястра Ядзя прыбягала і шапнула, каб ён ішоў да гасьцей, ужо старэйшы лёкай падыходзіў і напамінаў, што больш, мусіць, сустракаць няма каго. Аднак пан Станіслаў чакаў... Вось нехта пад'ехаў... Вочы пана Станіслава заіскрыліся, ён сышоў уніз на некалькі ўсходаў... але... раптам павярнуўся і пайшоў наверх да свайго ўласнага пакою.

Праз хвіліну за ім туды ўвайшоў лёкай-пакаёўшчык і падаў запячатаны конвэрт з князеўскаю каронаю. Пан Станіслаў, пачакаўшы, пакуль лёкай выйдзе, з нецярплівасьцю разадраў конвэрт і пачаў чытаць. Рука яго ўздрыгнула, халодны твар пачырванеў. Але праз момант ён быў зноў спакойны, халодны, важны, ня гледзячы на сваю маладосьць. Прачытаўшы яшчэ раз ліст, аздоблены каронаю, ён моцна зарагатаў.

— Будзем бачыць, князь Друцкі!—прамовіў ён і зноў весела засьмяяўся.—Гэй, Францішак!

Увайшоў лёкай.

— Скажы князеўскаму пасланцу, што яго не затрымліваюць!

— Пане, маршалак прыехаў!—пасьпешна паведаміў другі лёкай.

Пан Станіслаў падняўся і павольным крокам пайшоў насустрач прадстаўніку шляхты.

— Віншую вас, пане Ляскоўскі, як здатнага гаспадара, маладога гаспадара. Быў-бы я надта рады, каб паболей шляхты пайшло па вашай дарозе,—гаварыў тоўсты, брыты пад ангельца маршалак, уваходзячы пад руку з Ляскоўскім у салю.

— Я, шаноўны пане-маршалак, пазбавіўся аднаго з недахопаў, які надта шкодзіць шляхецтву—гэта гонар без экономічнага грунту,—адказаў яму Стась.—Панове, вось наш правадыр, пан-маршалак.

Госьці паўставалі і з пакланамі абкружылі маршалка, які на ільсьцівыя словы, ухмылкі адказваў прыкра-ветлівымі фразамі. Праз хвіліну і кабеты і мужчыны вянком стаялі вакол свайго „бацькі". Ляскоўскі застаўся па-за гэтым вянком і адышоў у бок.

— Вось, глядзі як яны каля яго ўвіхаюцца: вось тоўстая пані, а той сьлязьлівы стары!.. Ха-ха-ха!—Званочкам пасыпаўся з-за калёны сутрыманы сьмех.

Ляскоўскі падышоў да калёны. За ёю стаяла Ядзя з Зосяю, а крыху далей нейкі студэнт разглядаў разьбу старых дзьвярэй.

— Добры дзень, Ляскаўская Офэлія!—з нейкім прысмакам вясёла зьвярнуўся да Зосі Ляскоўскі.—Гэта вы кпіце над нашымі гасьцьмі?

— Даруйце, пане Ляскоўскі; папершае, на Офэлію я зусім ня здатна, а падругое—я клінкамі не займаюся, а мне проста падабаецца колёрытнасьць усяе гэтае групы,—адказала Зося.

Ядзя цягнула яе ўжо ў другі бок. Ляскоўскі доўга глядзеў за імі, пакуль яны не схаваліся ў мільгаценьні натаўпу. Павярнуўшыся потым у бок калёны, ён зноў прыкмеціў студэнта, галава якога яшчэ ніжэй схілілася над штучнаю ручкаю старых дзьвярэй...

Праз кароткі час уся грамада кранулася з палацу ў бок рэчкі, дзе ўздымаліся коміны абодвух заводаў. Больш паважным гасьцём былі пададзены коні з ляскаўскае стайні. Рэшта невялічкімі гурткамі пайшлі ўніз па чыстых прыбраных дарожках парку.

Над комінам гуты віўся лёгкі дымок, які, як кавалачкі баваўны, разыходзіўся па блакіту неба. Двор гуты быў завалены дрывамі, чыстым белым пяском, дзежкамі. Сям-там яшчэ валяліся тачкі, запэцканыя цагельным пылам, па розных кутках ляжалі стагі стружак, рознага сьмацьцьця. Відаць было, што будоўля толькі-толькі скончылася. Вакол нізкага і шырачэзнага будынку самое гуты былі раскіданы невялічкія дамы, ад якіх пахла смалою і хварбаю.

— Вось тут я працую!—паказала Зося Тодару на адзін з новых драўляных дамкоў, над ганкам якога на маляванай блясе было напісана „кантора".

Страшэнная духата дыхнула гасьцём, як толькі яны пераступілі цераз парог гуты. Зразу, што кідалася ў вочы, дык гэта тры гліняныя стагі, якія стаялі пасярэдзіне памяшканьня. На локця паўтара ад нізу ў гэтых стагох былі невялічкія ваконцы, з якіх вырываўся і біў па вачох несьцярпіма бліскучы сьвет. Вакол стагоў-пячэй, супроць кожнага ваконца стаяла

па аднаму чалавеку з доўгімі круглымі палкамі. Людзі, што абкружалі печы, былі страшэнна блядымі, іх сарочкі былі нашчэнт мокрыя, быццам толькі выцягнутыя з вады.

Паны і асабліва пані падаставалі хустачкі, абмахваліся імі, але гэта не пасабляла: ад пячэй ішла такая духата, што многім здавалася, быццам яны пачынаюць таяць, зьнішчацца.

— Дайце вы спакой! Як гэта можна стаяць у такім пекле? Броніс, вядзі мяне адгэтуль!

— Ціха, Магда! Ты абразіш пана Ляскоўскага,—схіліўшыся да чырвонае, як рак, пані гаварыў круглы, як галяндэрскі сыр, пан Броніс.

— Ой, ратуйце!—не сваім голасам закрычала пані Магда.

Ляскоўскі падскочыў да млеўшае пані і пасьпяхова вывеў яе на паветра.

— Ну, пачынайце!—скамандаваў ён, выканаўшы свае гаспадарска-доктарскія абавязкі.

Рабочыя, стаяўшыя напагатове каля пячэй, сунулі свае палкі ў блішчастыя ваконцы, і праз момант у паветры закружыліся яркія зоркі, якія з кожным кругам рабіліся ўсё больш цьмянымі і выцягваліся ў круглыя пухіры.

— Бах!—раздалося як з ружжа, і дробныя малюпаценькія шклінкі зазьвінелі ў паветры і пасыпаліся ўніз.

Увесь будынак гуты агаласіўся піскам і войканьнем. Кабеты, а за імі і мужчыны спалошным натаўпам кінуліся на двор.

— Што здарылася?—пыталіся адзін у другога, як ачухнуліся на сьвежым паветры.

— Гэта к дабру, к дабру, пане Ляскоўскі,—супакойна разважаў маршалак-ангелец, выходзячы апошнім з ім з гуты.

— Што здарылася?—напалі на іх са ўсіх бакоў.

— Ды нічога. Я прашу прабачэньня, калі ясныя пані напалохаліся. Крыху няздатны рабочы і ў яго шкло трэснула. Гэта часта бывае,—гаварыў Ляскоўскі.

Зося стаяла нездалёк ад сярэдняе печы і з цікавасьцю сачыла за тым, як рабочы праз сваю трубку выдзімаў шкляную кулю. І разам гэты выбух! Яна ўскрыкнула ад раптоўнага сполаху і замёрла на месцы. Калі яна апомнілася, дык першае, што ёй кінулася ў вочы,—гэта той самы рабочы, на якога яна раней глядзела. Ён закрываў абедзьвюма далонямі вочы, каля ног яго валялася жалезная трубка, ад чырвонага канца якое курэў дым. Зося кінулася да яго.

— Што з вашымі вачмі?

— Ня ведаю... ой як баліць.

Зося падхапіла яго пад руку і, падначальваючыся настрою натаўпу, пацягнула рабочага сьледам за вохаючымі панямі.

— Вы куды, панна Зося?

Перад ёю стаяў Ляскоўскі з маршалкам.

— Я... трэба яму дапамагчы!

— Кіньце, нічога з ім дрэннага ня здарылася. Ты заўтра зайдзі ў кантору да пана Стрэльчыка,—жорстка сказаў рабочаму Ляскоўскі і павольна вышаў з маршалкам на двор да сваіх гасьцей.

Зося пастаяла з хвіліну, потым павяла рабочага к другім дзьвярам, якія выходзілі на задні двор.

— Ня турбуйцеся, калі ласка! Дайце я павяду яго.

Каля самых дзьвярэй падышоў да іх высокі мужчына ў замасьленай жакетцы і з акулярамі на носе. Ён спагадна аглядзеў таварыша, які ўсё яшчэ не аднімаў рук ад вачэй, і ўзяў яго пад руку і з шчырасьцю ў голасе прамовіў:

— Дзякуй вам... за спачуваньне!—і вольнаю рукою ён моцна сьціснуў маленькую Зосіну ручку.

Незнаёмы чалавек у акулярах з параненым рабочым ужо ішлі па дварэ, выбіраючы найменей заваленыя розным хламам месцы. Зося пастаяла ў дзьвярах, з нейкім нутраным страхам паглядаючы на блішчастыя ваконцы ў цяжкіх вамгромністых печах. Адтуль цягнула духатою і густым чалавечым потам. З мешаным пачуцьцём страху і нейкае пагарды пакінула Зося душную гуту.

Калі яна выйшла на дарогу, то рознакаляровыя плямы часьцей ужо мільгацелі па крайніх дарожках парку. Зося ўспомніла, які піск і перапуд падняўся там у гуце, калі здарылася гэта, і як усе рынуліся скопам на двор. Чаму-ж рабочыя засталіся на месцы, ня кінулі свае працы? Няўжо гэтыя людзі, заўсёды мокрыя ад поту, такія сьмелыя ды харобрыя? Што будзе з вачмі гэтага небаракі? І хто гэты чалавек у замасьленай жакетцы і акулярах?

— Панна Зося!

Зося ўздрыгнула, адарваўшыся ад сваіх думак і запытаньняў, адказу на якія яна шукала ў сваёй маленькай галоўцы. Пад прысадаю стаяў пан Ляскоўскі.

— Я чакаю вас, а то вы засталіся аднэю. Дазвольце быць вашым кавалерам,—надта мяккім, нават нейкім асаладжаным голасам гаварыў Ляскоўскі, рашуча бяручы Зосю пад руку.

Зося засаромілася, пачырванела, стала вельмі пільна разглядаць дарожку ў сябе пад нагамі. Яшчэ ніколі ня было такога выпадку, каб пан Ляскоўскі выказваў ёй такую ўвагу. Калі ёй даводзілася быць у Ядзі і сустракацца з самім Ляскоўскім, то ён зварочваўся да яе ці ў ігрысталаскавым тоне, як да недаростка, ці зусім бязуважліва, як да нейкай пабочнай рэчы. Як ні крыўдны былі падчас такія адносіны, асабліва калі Зося здагадвалася палічыць сябе дарослаю, але яны былі ўжо звычайнымі і не маглі выбіць яе з каляіны. Цяпер-жа такі як быццам праўдзівы

тон, увага—і нават пад руку ўзяў. Мімаволі яна турзанулася, прагнучыся адхіліць ад сябе яго руку. Але Ляскоўскі быццам і ня прыкмеціў гэтага.

— Як спадабаўся вам завод?

— Я... я-ж бачыла яго раней,—не паднімаючы ад зямлі вачэй, адказала Зося.

— Ах, так, так! Вы-ж працуеце ў канторы, я і забыўся, выбачайце. Дый што я пытаюся ў вас аб заводзе? Лепш запытацца, які танец вы захацелі-б першым танцаваць. Я загадзя прашу вас пакінуць ваш вальс за мною. Добра?

Зося яшчэ больш пачырванела і павярнула ў другі бок голаў. Маўчала.

— З гэтым рабочым нічога ня здарылася, праўда?—адразу пераменіў гутарку Ляскоўскі.

— Як нічога?—на запытаньне адказала запытаньнем Зося, рашуча паднімаючы вочы на свайго кавалера.

— Так, нічога! Толькі крыху зацярушыў пылам, які падняўся ад выбуху.

— Што вы кажаце? Яму-ж так баліць, дый нават на дварэ яго палялі пад руку.

— Глупства! Вы не павінны былі бачыць нічога іншага, апроч таго, што я вам кажу,—халодным, строгім голасам прамовіў пан Ляскоўскі.— Зразумелі?

Зося сполахна-недаўменна зірнула на твар Ляскоўскага, які нібы адзервянеў. Але раптам гэтая адзервянеласьць зьмянілася ігрыста-вясёлаю ўсьмешкаю, і ён, як быццам нічога ня здарылася, гаварыў:

— Дык згода! мы танцуем з вамі вальс?

Яны былі ўжо каля палацу. Пан Ляскоўскі аддаў ёй прыветны ўклон.

— Выбачайце, я павінен выконваць цяпер свае гаспадарскія абавязкі. Вось госьці. Панна Скальска, што вы засмучаны і ў адзіноцтве? Вось вам мая маленькая прыяцельніца!—і з гэтымі словамі пан Ляскоўскі крануўся ў палац, прыпыняючыся то каля аднаго, то каля другога гуртка шпацыруючых гасьцей.

— Вы чулі, ён ужо прасіў яе на вальц? Хто яна такая?

— Адзета яна ня comme il faut.

— Мусіць нейкая бедная з яго далёкіх сваякоў. Гэтых сваякоў у Ляскоўскіх так многа.

— Кажуць, гэта яго канторшчыца.

— Ну што вы, канторшчыца? Стаў-бы ён канторшчыцу на вачох усіх прасіць на танец. З канторшчыцамі, ведаеце, скачуць мо'...—Голас стаў цішэй.

Гэткія фразы спаткалі Зосю. Куды-б яна ні павярнулася, усюды натыкалася на вочы, якія з цікавасьцю разглядалі яе з галавы да ног, перашэптваліся, не саромеючыся, што іх пачуе той, да каго гэтыя шэпты мелі адносіны. Нават рабая, з блёклымі вачмі, панна Скальская, якой Ляскоўскі даручыў Зосю, няпрыятна разглядала яе.

— Вы, мілачка, абулі-б бальныя туфлі, а то вам прыдзецца скакаць, дый яшчэ з панам Ляскоўскім,—параіла Скальская Зосі.

— Ня ваша гэта справа!—успалыхнуўшы, як пажар, адрэзала ёй Зося і адышла ад ае.

— За што вы раззлаваліся? Мо' у вас няма туфель?—агідна пыталася ўсьлед ёй панна Скальская.

Зося, то чырванеўшая, то бялеўшая ад крыўды, пайшла ў бок ад людзей. Па выкрутасах замысловатых дарожак яна ўсё аддалялася ад палацу. Людзкі гоман сьціхаў. Хутка яна апынулася ў дальняй, запушчанай частцы парку. Дрэвы стаялі тут густа і скрозь іх гальлё і лісьцё ледва праходзілі прамені заходзячага сонца. За адзежу чапляліся кусты сухадрэўкі, колкае шыпшыны. Тут была поўная цішыня і супакой, якія не парушаліся нават бульбатаньнем крыніцы, якая пераліvалася па зялёных каменьнях няглыбокага раўчака. Зося прабралася праз навіслае гальлё і кусты да вады і астудзіла свой палыхаўшы твар. Сэрца крыху сутрымалася і ня так моцна цюкала. Яна села пад густою клянінаю і, прыслухоўваючыся да мернае гутаркі крыніцы, унеслася сваімі лятуценьнямі нямаведама куды...

Раптам пачуліся трэскі суччa пад чымісь нагамі.

— Зося! Ты тут?

Гэта Ядзя. Толькі яна магла здагадацца, што Зося ня іначай, як тут.

— Зося! пачынаюцца танцы, цябе пан Стась чакае.

Не, яна цяпер туды ня пойдзе! Каб панна Скальская іржала, як кабыла, над яе простымі гамашамі? Ніколі!—Зося прытулілася, нават сапці баялася. Ціха.

— Дзе-ж бы яна была? Што гэта за прыцуда!—прагаварыла сама сабе Ядзя і паволным крокам пайшла назад да палацу.

Зося, як толькі заціхлі крокі Ядзі, ускочыла на ногі і бокам пайшла, каб абмінуць палац і выйсьці з маёнтку. Ужо пачынала цямнець, і яна лічыла, што ніхто ня ўгледзіць яе па дарозе. Мінаючы палац, яна ўжо ня прыкмеціла гасьцей, якія, мусіць, сабраліся ўжо баляваць. На газоне перад палацам былі расстаўлены даўгія сталы, каля якіх стаялі бочкі, а на іх вялізарныя бутэлькі; па дрэвах вакол газону разьвешвалі папяровыя ліхтары. Гэта зацікавіла Зосю і, прылажыўшы палец да губ, яна сачыла, як загараліся адзін за другім розцакаляровыя вагоньчыкі.

Але раптам ціш вечару разарвалася гукамі магутнага оркестру, якія віхрам паняслiся з расчыненых вакон палацу.

Зосю як разанула што. Яна ўбежкі памчалася па дарожцы ў бок заводаў і хутка апынулася па-за паркам. Па дарозе ў маёнтак ішлі людзі і моцна гаварылі паміж сабою. Зося збавіла шагу і павярнулася ў напрамак на гасьцінец.

— Мусіць, асьлепне, брат!—чуўся разважны зычны голас з завадзкое дарогі.

— Хто гэты рабочы?—захапіла Зосю новая думка.—Няўжо-ж гэта можа быць?

Яна задумліва ішла па сенажаці, падышла да парку і вышла на гасьцінец каля самых варотаў маёнтку. Паўз алеі, агорнутай ужо эмрокам, нясьліся далёкія пышчотныя гукі вальса, мяккі сьвет ружовых зялёных ліхтароў. Зося адвярнулася і нерашуча пайшла дамоў.

(Працяг будзе)

ГАСПАДАР

(Апавяданьне)

Цішка Гартны

I

Сьлесар Якаў Гузік, праходзячы паўз браму заводу, раптам спыніўся і паківаў галавою.

— Безгаспадарнасьць, дальбог-жа. Што-б узяць да падабраць, дык не. Валяецца—няхай валяецца... Пастаўлены сторaж, а каб паглядзеў—куды там. Ды загадчык, напэўна, ня раз бачыў—і таксама бяз увагі...

Якаў Гузік нагнуўся і падняў з зямлі здаровы кавалак жалеза. Падняўшы, пачаў яго разглядаць, мераць на пядзю, вылічаць.

— Гэта-ж выйдзе на некалькі ручак у плузе... Во... Цэляй пяць тэўшчынёю... Які недагляд, якая нядбайнасьць! Поўзавода расьсей—і хоць-бы што. Людзям не карціць... Мэрам-бы нікому ніякае справы,—паскарадзіўся ён сам сабе і рашуча крануў з месца.

— Гэта трэба сторажу пад нос паднесьці... Глядзі вось...

— Самусь!—выгукнуў Якаў Гузік, прачыняючы варотцы ў завод. Ніхто не аказаўся—стоража ня было пры варотцах. Тады Якаў Гузік крыкнуў мацней, але зноў астаўся без адказу.

— Гэта ліха ведае што!—вылаяўся ён і вышаў на вуліцу, каб пайсьці са скаргаю на стоража ў кантору.

На вуліцы яго перапыніў каваль таго-ж заводу Палікар Скрынка.

— Якаў!—пазваў ён Якава Гузіка.—Стой! Ты куды?

Якаў Гузік спыніўся і паглядзеў на Палікара Скрынку.

— Бачыш, у кантору.

— Чаго?

— Сьвінства, дый годзе... Паглядзі во, якім жалезам кідаюцца. За брамаю падняў. А гэты, сукін сын, Самусь і нібыта той. Валяецца—няхай валяецца... Пазаву, думаю, ды пакажу во, каб на другі раз пільнаваў...

Палікар Скрынка выпучыў на Якава Гузіка вочы і насьмешліва праказаў:

— Эх, ты, гаспадар, гаспадар! Няўжо табе прыстае гэта клапатлівасьць? Што ты думаеш гэтым выграць? Пахвальбу?..

Якаў Гузік крута павярнуў ад Палікара Скрынкі і накіраваў да канторы заводу. За ім усьлед паляцеў выбух заліўнога, пакатнага рогату.

— Гас-па-а-да-ар! Гга-ас-па-адар... Чча-кай крыху...

З-за дзьвярэй канторы Якаў Гузік прымеціў, як Палікар Скрынка праводзіў яго многазначнымі кіўкамі рукі.

— Няўжо яму гэта не надаела?—зьдзівіўся ён і пастукаў у дзьверы да загадчыка. Дзьверы аказаліся запертымі—загадчык не вярнуўся з абеду.

— Скутку не знайсьці,—вылаяўся Якаў Гузік і вышаў з канторы.

Якраз загудзела заводзкая сірэна. Чакаць загадчыка было нельга. Калі ён прыдзе—ды яшчэ ці прыдзе... А прыдзе, то ласьне яму будзе час займацца справаю аб кавалку жалеза?

„Які я цудны, аднака,—разважыў Якаў Гузік, ідучы назад да заводу:—стану аднімаць ад таварыша Фанарніка час. Ён-жа выжане мяне з габінэту. Дай ты рады, уздумаў... Чалавеку столькі абавязкаў, цэлае прадпрыемства ў руках, а я... Тьфу ты, нікудышніца"...

З гэтымі развагамі Якаў Гузік падышоў да ўваходу ў завод. Ён спакойліва намерыўся ступіць у двор, як сторож зьнянацку хапіў яго за рукаў.

— Ты мяне шукаў, Якаў?—запытаў ён.

Якаў Гузік у момант перамяніўся ў настроі і суворым паглядам кінуў на Самуся.

— Шукаў... З-за цябе мусіў у кантору хадзіць ды назад... Думаеш, я патвоему не даражу часам...

Сторож не чакаў гэтага ад Якава Гузіка і недаўменна, вытарашчыўшы вочы, глядзеў яму ў твар.

— Так, цябе ніколі не застаць на тваім месцы... Я ўжо не кажу пра тое, каб ты хоць каліва выявіў увагі да прыўручанае табе справы.

Сторож ня ведаў, што адказаць, і толькі паціскаў плячыма, мармычучы сабе пад нос.

Ён быў вельмі задаволены, калі ў адзін момант двое рабочых адгарадзілі яго ад Якава Гузіка, пацягнуўшы апошняга за сабою.

— Што ён да мяне мае?—скардзіўся цэламу дзесятку рабочых Самусь.—Бяз дай прычыны прычапіўся да чалавека, як смала, і ні рады... Каб цябе ліха, каб цябе...

Якаў Гузік, зразумела, нічога акрэсьленага ня мог прад'явіць Самусю. У яго галаве злажыліся выразныя думкі наконт знойдзенага кавалку жалеза. Вынікі з гэтага можна было рабіць важкія, але на ўсё трэба падбіраць асобны час і ўдатную прычыну. Рабіць крымінал, адрываючы не ў пару ад працы людзей,—ня прыстала... Будзь то загадчык заводу ці хоць-бы сторож... І не нарвіся апошні на Якава Гузіка з сваім запытаньнем, засталося-б бяз лішняе гаворкі і непатрэбнае лаянкі. А то... Якаў Гузік яшчэ пры дзьвярах у майстэрню паднёў угару знойдзены кавалак жалеза і памахаў ім у бок Самуся. Праўда, усьлед гэтаму ён упічна сабе засьмяяўся і прақазаў да рабочых:

— Гэта мая надмерная стараннасьць. Натура гэткая—не магу цярпець, калі бачу глум ці непарадак. То-ж усё наша праца, нашы стараньні... Калі мы іх не шанаваньмем—тады?..

Рабочыя не пасьпелі выявіць сабе, да чаго былі Якавіны словы, і пакінулі Якава Гузіка без адказу... Ён нездаволена кінуў паглядамі ўправа ды ўлева і пайшоў да сябе, к сьлясарнаму цэху.

У майстэрнях пачыналася праца: вярцеліся такарныя варштаты, бразкала начыньне, шыпела тачыла. У кавальскай майстэрні хтосьці знарок надзвычай моцна ляпнуў молатам па лісту жалеза. Рэзкі ляск прайшоў па ўсяму будынку, балюча ўрэзаўшыся Якаву Гузіку ў вушы.

— Мудрагельства—ня болей,—вылаяўся ён.

І не пасьпеў дакончыць думкі, як пачуў знаёмы голас:

— Гаспадар! Гга-аспадар!

Ён паглядзеў у бок і ўпёрся вачыма ў Палікара Скрынку.

— Ты зноў са сваім...—нездаволена праказаў Якаў Гузік.

— Чым скончылася ў канторы, скажы?—яхідна перабіў яго Палікар Скрынка.

Якаў Гузік маўчліва ўсьміхнуўся і пайшоў далей.

Спыніўшыся каля свайго варштату, ён раптам перанёсься думкамі ў нядаўнае мінулае і праказаў:

— Кпіць і хоць-бы што... А замест гэтага—прылажыў-бы чалавек болей стараньняў, тады... Пры ахвоце ды адданасьці працы і парадак будзе і нічога ня страціцца. Калі ўспомніць... Чым-жа дрэнна была наладжана наша паходная майстэрня? Люба! Дагляд, парадак, чыстата... Ці-ж гэта вада? „Гаспадар".

Ён яшчэ раз аглядзеў паднятае пры варотах заводу жалеза і прыняўся за работу.

II

Якаў Гузік зацягнуўся ў працу да забыўнасьці. У яго руках напільнік хадзіў па сталі, як смычок па струнах. Яго скрып—то былі зыкі ад струн.

Яго твар выдаваў настрой замілаваньня. Пагляд—сьвяціўся здавальненьнем. Каб хто за ім сачыў, то бачыў-бы, як Якаў Гузік старанна вымяраў куты выпіленых шрубак, агладжваў у іх рубы, наводзіў ровень. Гатовыя—складаў памяркоўна, акуратна ў правільныя стосікі. Для яго ў часе працы ня было іншага сьвету, апроч таго, які абыймаў сабою варштат, напільнік, кавалкі сталі. Загэтым Якаў Гузік амаль што не азіраўся ў бакі, не аднімаў ні вачэй, ні ўвагі ад работы. Рэдка, мо' дватры разы ў гадзіну, яго ўрокі траплялі на засмуглае, але асьветленае сонцам вакно. Кладучы гатовыя шрубкі, ён таксама зазіраў на знойдзенае жалеза, якое ляжала тут-жа.

Але ні пагляд у вакно, ні заўвага да жалеза не перашкаджалі яго роўным, адмераным поцягам напільніка па сталі.

„За працаю—будзь працаўніком", разважаў ён сам з сабою: „Трэба разумець, што ты працуеш не на вецер, ня ў чужую кішэню. Працуеш—гэта ствараеш. Чым лепш створыш тую ці іншую рэч, тым большую прынясеш сабе карысьць. Сабе... Вось што дорага. Каб, здаецца, усім, як мне, гэта было ясна і блізка—тады... я-б не знаходзіў тады за варотамі заводу кінутага жалеза... „Гаспадар". Чамусьці Палікару гэта сьмешна... І ўшалопаў, ліха ведае што! Замест таго, каб лішні раз молатам стукнуць—ён пяць разоў языком ляпне... І лічыць сябе задаволеным. А там"...

Якаў Гузік нагнуўся, каб палажыць чародную шрубку, як пачуў на сваім плячы чыюсьці руку.

— Вось дык запрацаваўся — можна жывым украсьці,—пачуў ён каля вуха.

То быў Яўсей, старшыня заўкому.

Гэта зьдзівіла Якава Гузіка.

За два гады яго працы на заводзе, калі Яўсей кіраваў заўкомам,—Якаў Гузік ня меў выпадку сыйсьціся з ім ці пагутарыць. Неяк ішлося так, што ён, Якаў Гузік, аставаўся нікім незаўважаным, сам сабою, адным. А тымчасам не прапускаў ніводнае сходкі, ніводнае вытворчае нарады. Нават на многіх выступаў, падаваў пропозыцыі, спрачаўся—і ўсё гэта недзе гінула, нікла. Нарэшце, мо' з паўгода назад, з лёгкае рукі Палікара Скрынкі, яго пачалі пазнаваць як „гаспадара". Чаму „гаспадара"? А таму, што, ведаеце, Палікар Скрынка падлічыў, што на кожныя тры выступленьні Якава Гузіка два з паловаю падаюць на гаспадарскія пытаньні; а яго гутаркі агульнага характару—выключна круцяцца вакола „ўпарадкаваньня вытворчасьці на заводзе". Яшчэ прымела Палікару Скрынцы заўважыць Якавіну клапатлівасьць над парадкам у заводзе: падняць кінутае жалеза, падмазаць станок, прычыніць дзьверы. Усё гэта казала за яго пільную гаспадарнасьць—чаму-ж ня даць Якаву Гузіку мянушкі „гаспадар"? Палікару Скрынку гэта было за ўцеху, калі ён гукаў Якава Гузіка, дзе трэба, а дзе ня трэба, гаспадаром і паўсюдзіў гэту мянушку па заводзе і за яго сьценамі. Чуў аб Якаву Гузіку, як аб „гаспадару", і прэдзаўком Яўсей.

Якаў Гузік ня ведаў, як праламлялася ў Яўсеі значаньне яго мянушкі. Ну, ніколі-ж ня думаў, каб так, як у Палікара Скрынкі... „А хоць-бы і так", рашыў Якаў Гузік у той момант, калі ўгледзеў перад сабою Яўсея.

Той ня даў Якаву Гузіку спыніцца на гэтай думцы, як вылажыў перад ім зусім адваротнае.

— Ты знаеш,—сказаў ён Якаву Гузіку:—у мяне зарадзілася думка аб тым... як-бы табе сказаць... каб гэта цябе высунуць намесьнікам загадчыка нашага заводу. У мяне пра цябе пыталі ня раз...

Якаў Гузік вытарашчыў на Яўсея вочы і ня ведаў, у чым тут справа—у жарце ці ў гіроніі. І палічыў лішнім весьці далейшую гутарку на гэту тэму... Але Яусей наступаў:

— Кадаўбец нас пакідае. А я ня толькі чуў аб табе многа цікавага, а і ведаю добра сам, што ты... Думаеш ніхто не заўважае?..

— Гаспадар?—перабіў Якаў Гузік і паглядзеў на жалеза, якое мулялa яму вочы...

— Я насур'ёз, таварыш Гузік... Гэта не мяне аднаго думка, а і... Я раджу падумаць аб гэтым...

Якаў Гузік, казаць праўду, зрэдку тайком сам-на-сам дапушчаў думку аб гэтым. Але яе зьдзяйсьненьня ён не спадзяваўся... У яго ня было вялікіх намераў, не вытыркала жаднага імкненьня да адказных пасад. І над тым, што-б ён рабіў, каб гэта яму выпала што-кольвечы нечаканае ў гэтым напрамку, Якаў Гузік не гадаў.

— Я падумаю!—сказаў ён Яўсею, і калі той раптам адвярнуўся на вокліч, прыкусіў губы.

„Глядзі ты, якая трапіла да мяне сьмеласьць. Гэта табе не жалеза падняць!"

І чамусьці да самага вечара ўжо зусім іначай ішла ў яго праца.

Напільнік хадзіў тым-жа тэмпам, што і да Яўсея, а вось спору паменшала. Паменшала спору, бо, Якаў Гузік адчуваў, пабольшылася ў галаве навеяных Яўсеем думак. „Намесьнікам загадчыка заводу! гм... Яно не бяз цікава, ды каб ня было падобна да жарту! Ці-ж мне калі аб гэтым прыходзілася думаць усур'ёз, дай ты рады... А тымчасам... Ня ведаю адкуль гэта бярэцца", недаўмяваў Якаў Гузік...

Ён пацепаў плячыма і падазрона пазіраў у той бок, дзе схаваўся Яўсей. Хоць-бы той не чапаў яго! А то проста разварушыў Якавіна нутро, ускаламуціў жаданьні... Чаго ў сьвеце ня бывае! Стаць кіраўніком гэткага прадпрыемства, як іх завод. З пяцістома рабочых, ласьне малая справа?

І ў гэтым раздуме Якава Гузіка таілася салодкая заваба і трапяткая трывога. Ранейшая ўвага да свайго варштату вачавідкі пашыралася, расла і пераносілася на цэлую майстэрню і нават на ўвесь завод. Руліла, няпрошана кратала сэрца нячыстасьць вокан, раскіданасьць матэрыялу па праходах. Вуньдзе чамусьці сьвіціцца выбітая шыба, а на дварэ ён заўважаў ня раз няпрыбраныя кучы сьмецьця. Нават ня шчыльна прычыняюцца адна да аднэй форткі заводзкіх варот... А аб сторажы і казаць ня трэба... Каб гэта ды сапраўды вышла так, што ён, Якаў Гузік, пападзе ў намесьнікі...

Думкамі ды разважаньнямі ў гэтым напрамку Якаў Гузік упёрся ў зацяжны сьвіст гудка... Напільнік займа здароў вываліўся з яго рук, а адзеньне ня ўпрыкмет ачулася на плячах.

Ён, дбайліва азіраючы па бакох, пайшоў праўцом да дзьвярэй. Мінаючы варштаты, абмацваў іх, падчышчаў; падняў з падлогі некалькі

кавалачкаў дрэва і дроту. А стрэўшыся на дзядзінцы з майстрам стругальнага цэху, заўважыў:

— У нас не дастае гаспадарнасьці.

Майстар паківаў галавою і адказаў:

— На гэта патрэбны адпаведны чалавек...

III

Для чаго былі сказаны майстрам стругальнага цэху гэткія словы? Ці ня думаў ён прайсьціся па Якаву Гузіку? А мо' што-кольвечы ведаў і ён ужо аб пушчаных Яўсеем думках пра намесьніцтва?

Якава Гузіка гэта цікавіла і займала. Займала чым далей, тым мацней. І ўдому, калі ён прышоў з заводу, ну проста ня ішла яда ў горла... Усё вакольнае адышло на задні плян. Маленькі столік у кутку цеснае каморкі прыняў выгляд чарцежнага стала. Якаў Гузік, не адказваючы жонцы на запытаньні, аблажыўся папераю і пільна штосьці на ёй крэмзаў. Крэмзаючы, вылічваў многа розных лічбаў. Задуменна меркаваў пляны і, нецярпліва адрываючыся ад стала, тупаў два крокі наперад, два крокі назад па малюпаткай каморцы.

— Ты-б павячэраў, а тады браўся-б за гэту сваю работу,—нясьмела намякала жонка. Яна мяльком закідала на Якавіны паперы ўзрокі і зьдзіўлена адварталася назад: на паперы сталі выведзеныя Якавам замысловатыя малюнкі дамоў, баштаў, дарог...

„У чым справа?" здагадвалася кабета; яе доўга скрабла інтрыга адкрыць сакрэт сёнешніх мужавых паводзін. Жонка здагадвалася аб адным, што муж заняўся нечым сур'ёзным. І адзнаньне гэтае сур'ёзнасьці спыняла яе адрываць Якава ад яго думак... „А вось ён не пашкадуе паведаміць", падумала яна. І абмылялася: Якаў Гузік ня меў падстаў весьці з жонкаю гутарку аб сёнешняй размове з Яўсеем. Прызнацца, калі аднесьціся да гэтага сур'ёзна, то нічога акрэсьленага ня выявілася. Быў адзін намёк. Але намёк трапіў у каразьлівае месца. Чаму? Таіцца нечага: Якаў Гузік сапраўдны гаспадар ад галавы да ногцяў на ножных пальцах. Ён нарадзіўся для працы, для гаспадараньня... Згодна яго думак, стары сьвет рушыўся таму, што ня ўсе працавалі, а з працы адных нажываліся другія. Новы-ж сьвет акрэпне і ўзбагацее тады, калі кожны яго будаўнік будзе добрым гаспадаром. Дбайнасьць у працы, шчырыя адносіны да людзкога дабра, клопат за агульным, як за сваім,—вось штурхачы россквіту новага жыцьця... Праўда, ён, Якаў Гузік, ня мае сілы рэформатараў і нездатны на вялікія замахі,—ну-ж колькі ў яго хапае мажлівасьці, ён дае жывы прыклад чулага гаспадара... Ён згодзен, што Палікар Скрынка ёмка пацэліў у точку, калі назваў яго гаспадаром. Але таксама прышлося-б Палікару Скрынку і яму падобным згадзіцца, калі-б ды... Яўсеевы словы мелі належны вынік... Згадзіцца перамяніць свае погляды на пытаньне гаспадаркі...

Кавалак жалеза, які выклікае жарты, занадта цьвёрды, каб растаць у сьмеху...

Годзе сьмяяцца там, дзе патрэбна сур'ёзу... Якаў Гузік заўсёды дапамінаў аб гэтым... Мажліва, каб ён меў сілу і волю, у форткі заводзкіх варот не пралез-бы ніводзін кавалак жалеза... Прыклады былі—паходная сьлясарня. Цяжкім часам, а лічылася ўзорнай на фронце. Працоўная дысцыпліна стаяла на яць... Яму здавалася ня раз, што разьвярніся майстэрня ў завод—справа-б намнога палепшылася. Якаў Гузік трымаў-бы струну нацягнута... Здавалася...

Але пайшлі іншыя часы, усё перакруцілася, зьмянілася, і ён стаў радавым рабочым...

Радавым, няпрыметным...

І ў той час упарта ўважлівым, старанным, цяглым...

Гаспадарнасьць, гаспадарнасьць...

На добры лад ён мог-бы спрабануць на кіраўнічым месцы. Уся машынэрыя яму вядома. І стругальнае, і кавальскае, і сьлясарскае, і, нават, сталярскае рамёслы яму ня чужы. Найшоў-бы сьцежкі і да ладу з рабочымі... А калі-б часамі і не патрапіў у чым—на другі раз паправіўся-б... Падума-аць!

К адзіннаццатай гадзіне Якаў Гузік узважыў свае сілы і здольнасьці і вывеў, што яму пара ўзыйсьці на вышэйшую ступню.

Самому не вымагаць, а калі прапануюць—ня ўхіляцца. Да чаго трусьлівасьць і нявера ў свае сілы! Прэч, ня ў наш век! Рабочаму не павінны быць страшнымі перашкоды на шляху яго пасуваньня наперад. Ён не павінен супыняцца перад сумненьнямі. Жыцьцё перадалося яго кіраваньню—трымай мацней лейцы ў руках...

— Я заўтра сумею даць Яўсею падцьвярджальны адказ. Думаеце—рабеце. Пастараюся ўскладзеныя на мяне надзеі апраўдаць,—заключыў Якаў Гузік і згарнуў свае „чарцяжы".

І жонцы адкрыўся:

— Прызнацца табе, Алена, мне сёньня намякалі аб адміністрацыйным месцы. Прэдзаўком Яўсей!

— Я бо бачу, што ты гэтак захапіўся.

— Цудная, трэба-ж падумаць, пакуль даць адказ.

— Дык ты, вядома, рашыў?

— Рашыў, калі-б на гэтым стала...

— А то?..

— Бывае ўсякся... Магуць і перадумаць...

— Чаму так?

— Здагадваюся... Ты думаеш, я адзін такі, якога можна... У нас, бачыш, болей за пяць соцень рабочых... Есьць і вартнейшыя мяне... Чаму, канешна, каб я?

— А бо ты ня сумеў-бы з другіх? Хто вельмі цяперака навукі вялікія канчае. Ведама... А ты, вось, пятнанцаць гадоў на рамясьле.

Якаў Гузік не хацеў перад жонкаю таіць: ён чуе ў сабе здольнасьць на гаспадарскае месца. І, праўду сказаць, мажліва, што падобных яму на іх заводзе ня вельмі многа. Наўрад ці хто адмеціў у каго-кольвечы падобную яго дбайлівасьць. Усяго, што нейкая скромнасьць не дае яму высунуць сябе ў вачох адпаведных устаноў...

Іншы на другога-б!.. Выцягне язык і, здаецца, яму мора па калені... А каб за справу ўзяцца—ломіцца, брудзіцца, тандэтуецца... А тымчасам часта яго бярэ... Да прыкладу—Палікар Скрынка... „Гаспадар“. Упік...

На добры лад—варта было-б гэткіх Палікараў падвучыць справе гаспадараньня. Гэта не ўкараціла-б іх языкоў...

— Ты заўсёды маўчыш і цябе заціраюць...—папікнула Якава Гузіка жонка.

Ён не адказаў нічога.

„У кожнага свой розум“, падумаў пра сабе.

IV

Назаўтра Якаў Гузік нёс пры сабе на завод гатовае цьвёрдае рашэньне—згадзіцца на пропозыцыю Яўсея. Меркаваў самому наведаць прэдзаўкома і выказаць яго так выразна, каб ня было жаднага сумненьня. Каб ня было адыходу ні назад, ні ўбок. Не павінен-жа Яўсей таіць учарашнюю гутарку. Якая-б то была таварыскасьць!

Але зазірнуўшы ў памяшканьне заўкому, ён нікога там не застаў. Ён адлажыў на посьле... Прышло тое посьле—і Якаву Гузіку не ўдалося стрэцца з Яўсеем таксама... Тады заставаўся час па рабоце і гэты зманіў яму... Як назнарок, як прымха якая, Якаў Гузік ня мог сыйсьціся з прэдзаўкомам ня толькі назаўтра, а і на працягу цэлага тыдню.

Адкуль браліся тыя прычыны, хто строіў тыя перашкоды—іх была процьма... Ён дзівіўся. І, нарэшце, у Якава Гузіка растала ўсякая вера, зьнікла ахвота, апаў настрой. Дома ён ня ведаў, як і што адказаць на жончыны запытаньні. Некалькі разоў бязьверна адкладаў з адказам на заўтра, а раз намякнуў на акрэсьлены тэрмін, на які быццам-бы справу адлажылі. А ўжо к канцу тыдню, перад самым канцом работы, ён рашыў сазнацца жонцы, што ўсё было кламствам. Ужо нават пальцы яго рук намерыліся злажыцца ў кулак, каб магчы ўзмоцніць пачуцьцё разувер'я, як Яўсей зьнянацку прыдушыў яго ў Якавіным нутры.

— Нарэшце!—гукнуў ён на адгоне мо' двух сажняў ад Якава Гузіка, калі той складаў начыньне. Выращана! А колькі каштавала сілы... Ледзьве пераканалі... Прыходзілі з аддзелу і з раённага камітэту. Ня хочам. Невялікая кучка крыкуноў... Што з яго за актывісты, крычаць... Ніколі слова людзкага не пачуць. . Зусім адарваўшыся ад палітычнага жыцьця... І за вошта яны на цябе? Палікар Скрынка, Самусь, Дзямян Рашка?.. Ты з імі меў што?

Якаў Гузік пацiснуў плячыма.

— Мажліва таму, што я люблю работу, а яны пустую гутарку. А мажліва... Ці-ж здагадаешся?

— Вось і я ніяк не магу здагадацца. Упрэцца, ведаеш, каторы з іх і на ўсё горла раве: „Якава Гузіка—ня варта“. Але, нарэшце, большасьць заўкому аказалася на нашым баку... А цяпер—усё пойдзе без перашкод... Ты толькі не зважай на нічога, мала што. Ёсьць яшчэ гармідарцы... Гэта наша бяда, ведаеш... Але я—не патураю на іх...

Запыталі ў мяне аб кандыдату, і я зразу на цябе. Думаеш, я ня ведаю, хто і як адносіцца да справы?

Ужо гудок вяшчаў аб канцы работы і вакола рабочыя пакідалі завод, а яны—Якаў Гузік з прэдзаўкомам Яўсеем—рэзва абгаварвалі пытаньні ўнутрызаводзкага жыцьця. Яўсей выкладаў шэраг дробных недахопаў: у справе пастаноўкі гаспадаркі заводу, у некаторай нядбаласьці адміністрацыі да патрэб рабочых, у недасканаласьці працоўнай дысцыпліны з боку асобных рабочых.

Якаў Гузік шчыра выказаў сваю падзяку таварышу прэдзаўкому за яго рэкомэндацыю і цешыўся схожасьцю паглядаў на справу адраджэньня гаспадаркі і прамысловасьці краіны. Якаву Гузіку ня верылася, каб у Яўсеі, невядомым для яго чалавеку, таіліся аднакавыя з яго, блізкія яму думкі. Гэта асаблівасьць распаляла ў ім веру ў гатовую падтрымку яго на вызначанай працы. Ды, наогул, увесь факт розных гутарак аб ім сьведчыў аб тым, чаго ён і не чакаў. Увачавідкі расла яго вядомасьць. Значыць, дарэмна ён раней думаў, што яго ніхто ня ведае, ніхто не прыкмячае, апроч ліхамысных Палікараў... Жыцьцё—складаная рэч, у якім цяжка разабрацца. У адносінах да яго, якраз, гэта жыцьцёвая складанасьць увабралася завабнаю пікантнасьцю. Прасьцей кажучы, жыцьцё яму, Якаву Гузіку, радавому сьлесару другога дзяржаўнага заводу сельска-гаспадарчых машын, наперакор усяму рэзва ўсьміхнулася.. Дык, калі так, чаму-ж не адказаць жыцьцю тым-жа настроем? Го! Ён валодае сіламі, ахвотаю і жаданьнем да жыцьця і да творчасьці. Ён любіць гэту творчасьць, шануе яе, аддань ёй. Чым большы яе размах— тым для Якава Гузіка цікавей. У гэтым пасьпее ўпэўніцца Яўсей, рабочыя, тыя, хто вызначае яго на адказную працу. Інакшым тонам гутарыцьмуць і Палікары Скрынкі.

Якаў Гузік уверана сказаў:

— Я рашыў паспрабаваць. На другі дзень, калі вы мне намякнулі, прышоў да заключэньня—згадзіцца... Пасьля-ж, не сустракаючыся з вамі, крыху ўсумніўся... А зараз—добра... Мне думаецца, што я знайду ў сабе сілы досі...

Яны на ўвесь завод заставаліся адны. Рабочыя вышлі, усё маўчала. Толькі ўборшчык падмятаў падлогу. Ён раз-по-разу азіраўся на іх, але не адважваўся перабіваць. Мала аб чым яны гутарацъ! Нарэшце ня ўцерпеў: яму дораг час, і хто-б сабе ні быў Яўсей ці Якаў Гузік, яны не павінны займа здароў выкрадаць яго, уборшчыка, час. Гэта варт дапомніць—упадабае хто, ці не. І сторож гукнуў:

— Таварыш Яўсей, вы яшчэ доўга?..

— Вядома, не,—адказаў ён і разьвітаўся з Якавам.

Той-жа пасьпешна адзеўся, і лёгкі, бадзёры, як ніколі, пабег да дзьвярэй. У выхадзе з іх ён ня мінуў выявіць перад уборшчыкам сваю гаспадарнасьць, заўважыўшы:

— Ты не забудзь, Лукаш, праверыць замок.

Уборшчык усяго пасьпеў азірнуцца, як Якаў Гузік зьнік за варотамі заводу. Аднак, ён не застаўся без адказу.

— Глядзі-ы ты, які руплівы! Што-б было, каб гэта зрабіў яго гаспадаром!—кінуў Лукаш удагон Якаву Гузіку.

V

Якаў Гузік тупаў па дзядзінцы заводу і пільна азіраў: заводзкі будынак, склады машын, агарожу, вартоўню. Колькі ўсюды недахопаў, недаглядаў, вынікаў нядбалых адносін да справы. Гэта-ж усё яму цяперака давядзецца папраўляць. Ох, ды працы наперадзе! Праўда, ён, Якаў Гузік, не адзін. Ёсьць загадчык, на якім болей адказнасьці за прадпрыемства, але і ён ад гэтага ня вольны. Намесьнік загадчыка—не малое званьне і не малая адказнасьць. Ён ня толькі можа загадаць рабочаму, ён мае права зрабіць тую ці іншую заўвагу і загадчыку. А ў час, калі загадчык адсутнічае, намесьнік—гаспадар. І цяпер вось Якаў Гузік у гэтым стане: загадчык паехаў у сталіцу, а ён выпаўняе яго абавязкі. Хто аб гэтым ня ведае? Кожны чалавек, які мае дачыненьне з заводам, у курсе справы... Якаў Гузік падмеціў, выходзячы на заводзкі дзядзінец, як спрытна сторож Самусь уступіў яму дарогу, выцягнуўшыся ў струнку. Толькі мігнулася рука да казырка шапкі... А хутка ён праканаецца аб адносінах да сябе з боку рабочых... Ці-ж ня цікава? Ого!

Якаў Гузік прайшоў па дзядзінцы заводу, аперазаў яго абходам з надворнага боку і зазірнуў у сярэдзіну заводу. Завод працаваў. Усё гуло, раўло, вярцелася. І вось, калі ён увайшоў у завод, яму здалося, што ў сугучнасьць працоўнага галасу ўплёўся чулы подух задзіўленьня, выказаны рабочымі. Каб пералажыў яго на словы—атрымалася-б:

„Ага-а, Якаў Гузі-ык!“

Поруч з гэтым да яго накіравалі сотні вачэй. З-за калаўроткаў, варштатаў, з-за рамянёў і слупоў несьліся к яму цікавыя погляды Ад іх нельга было ня сумецца: бач, штодня будзе тое самае. І калі ён, Якаў Гузік, сумее сябе паставіць належным чынам — тады... Вось задача, над

якою трэба доўга думаць. Бо кожны пагляд—гэта выпрабоўнае мацаньне... Сярод усіх іншых дзесьці хаваецца і пагляд Палікара Скрынкі, Даямяна, Рашкі і многіх ім падобных.

Якаву Гузіку не сьцярпелася, каб не павярнуць вачэй да кавальскага цэху. З молатам у руках, пазіраў на яго Палікар Скрынка. Што ён думае? Няхай што хоча думае, а ён з далікатнасьці прывітаецца з ім, як і з усімі іншымі. Начальнічы чын не павінен дыктаваць адносінамі з таварышамі...

Якаў Гузік ціхаю хадою абыйшоў усе майстэрні заводу, прывітаўся з рабочымі. Гаспадарскім вокам аглядвеў варштаты, сталы, начыньне, гатовыя рэчы. Амаль ня з кожным рабочым памяняўся двума-трыма словамі. Ходзячы, падняў не на месцы пакінутыя напільнікі, малаткі, кавалачкі дроту, жалеза.

Нарэшце апынуўся ў кавальскім цэху. Падышоў да Палікара Скрынкі і запытаў яго аб ходзе працы ў гэтым цэху. Палікар Скрынка зьбянтэжыўся ад нечаканасьці і не знайшоўся, што адказаць.

Але не пасьпеў Якаў Гузік зрабіць некалькіх крокаў у бок, як да яго дайшлі выразныя склады слова: „Гаспадар“.

Якава Гузіка ўразіла, але ён не адвярнуўся. Толькі сам да сябе прамовіў:

— Калі, з аднаго боку, ня трэба быць бюрократам, то з другога—нельга весьці працы без гаспадарскага аўторытэту... Яго павінны адчуць тыя, хто ня любіць працаваць...

Яшчэ, набліжыўшыся да выйсьця з заводу, дадаў:

— За працаю мусіш быць загартаваным гаспадаром, а ня вялым абібокам...

Аднак мулкаю гарошынкаю ў сэрцы націскала прыкрае пачуцьцё ад Палікаравых слоў. У вошта яны вырастуць далей? Ці не пярэйме іх адзін за другім увесь кавальскі цэх? А можа яго словы разрастуцца ў цэлыя сказы? І тады?..

— Ды што тады!—рашуча праказаў перад кантораю Якаў Гузік.—Думаючы аб гэтым,—нічога не магчымеш зрабіць... А я мушу рабіць, рабіць...

Цэлая плойма бягучых пытаньняў з заводзкага жыцьця апанавала Якавіну голаў. Ён увайшоў у кантору, сеў за сталом і пачаў абдумоўваць кожнае з іх. Рацыяналізацыя, рэжым экономіі, паляпшэньне якасьці вытворчасьці спляталася ў адзін ланцуг і радзілі агромныя пляны. Завод мігаў перад Якавам Гузікам фордаўскімі прадпрыемствамі. Бясконцаю стужкаю віўся конвэйер аўтоматычны, выходзілі на двор шарэнгі трактараў, жняярак, малатарань. Лес каміноў вянчаў пяціпаверхавыя гмахі будынкаў... Дзесьці далёка-далёка цягнулася палоса плённае творчае працы...

— Ці можна ўвайсьці?—перабіў яго знаёмы голас у прачыненыя незаўважна дзьверы.

— А... калі ласка,—адказаў Якаў Гузік і адхіліўся ад стала.

Перад ім стаяў Яўсей.

— Я перашкоджу? Толькі на хвілінку,—папярэдзіў ён Якава Гузіка і пры гэтых словах сеў каля стала.

— Сядайце,—падмацаваў Якаў Гузік Яўсеева права сесьці.

— Нічым не замінаеш.. Я яшчэ толькі што асвойтваюся з працаю. Толькі што аглядаў завод, знаёміўся з процэсам працы. Прызнацца, ня зусім добра ішла дагэтуль справа... Многа-многа давядзецца палажыць энэргіі, пакуль паставіць на нормальны шлях. Было шмат недагляду...

— Зразумела,—згадзіўся Яўсей:—справа ня лёгкая... Ну, як цябе, стрэлі рабочыя?

Якаў Гузік памаўчаў. Пасьля, зрабіўшы нявыразную міну на твары, адказаў:

— З першага разу цяжка вызнаць настрой рабочых... Здаецца, не заўважна было няпрыязнага ўражаньня... Хоць...

— Што хоць?—падхапіў Яўсей.

— Ды яно пустое... Палікар Скрынка правёў мяне звычайнаю лаянкаю. Напэўна, не ўпадабаў майго назначэньня. Але-ж ласьне ўсім угодзіш? Або павінна ад капрызу ядынак цярэць агульная справа? Я трымаюся правіла...

Якаў Гузік упэўнена прайшоў па пакоі канторы.

— Тады добра, калі ад гаворкі не адстае і праца, а калі язык замяняе рукі—то машына не пакруціцца... Я-б прасіў, таварыш Яўсей, каб і з твайго боку гэта мелася на ўвазе...

— Мне гэтага ня трэба казаць! Я сам добра разумею... Каб у мяне былі іншыя думкі, ці-ж бы я, думаеш, так за цябе стаяў? Браток ты мой... Мая праца, як прэдзаўкому, не разыдзецца з тваёю... Хіба якія-небудзь надзвычайныя здарэньні таму паперашкодзяць. Праўда...

Чагосьці абодва паглядзелі ў вакно.

— Праўда,—працягнуў Яўсей:—для наладжаньня тваіх з рабочымі адносін прыдзецца разоў колькі выступіць перад імі. Трэба будзе зрабіць адзін—другі сход, організаваць вытворчую нараду... Я, прызнацца, і прышоў за тым, каб цябе папярэдзіць аб гэтым. Мы склікаем праз тыдзень на суботу вытворчую нараду; ты павінен будзеш выкласці свае меркаваньні наконт пэрспэктыў... Га?..

Якаў Гузік мэрам-бы сумеўся, але хутка ўроўнаважыўся і адказаў:

— Паколькі будзе датычыць майго погляду, я ні перад кім яго ня ўтою. Добра... Склікайце... А Фанарнік таксама будзе выступаць?

— Калі прыедзе да гэтага часу, запрагом і яго... Але наўрад ці ён вернецца да суботы.

— Я думаю, павінен вярнуцца...

Яны яшчэ нейкі час пагутарылі і пад гук сірэны пакінулі кантору.

VI

Усе, хто цікавіўся дабрабытам заводзкага жыцьця, мог заўважыць здольную гаспадарскую руку Якава Гузіка. Яна, гэта рука, дзе ні прыкладалася, пакідала заметны сьлед. Усіх захапіла яго дбайнасьць—хоць-бы на завадзь знайшоў хто на дзядзінцы закінуты кавалак жалеза,—ані. Вароты ўшчыняліся акуратна, у вокнах зьявіліся шыбы. Да агульнага шоламу шківоў, да стуку малатоў і скрыпу напільнікаў далучыўся стук сякер, абчэсваўшых дрэвы для новага будынку пад склад. Над гатовымі вырабамі распасьцёрся новы брэзэнт, бароначы іх ад дажджу... Па майстэрнях сярод рабочых пайшлі чуткі, што Якаў Гузік атрымаў ліцэнзіі на новае абсталяваньне заводу. Намякалі на конвэйер... Многім выразна кідалася ў вочы аднаўленьне заводзкага жыцьця...

Але рэзкім няладам гучэлі цішком і адмоўныя да Якава Гузіка ноткі. Ён гэта заўважаў, бываючы ў заводзе ці седзячы ў канторы...

А перад вытворчаю нарадаю яму данесьлі, што некаторыя з рабочых зьбіраюцца яго „крыць". Нават, падказалі яму, мэрам-бы сам загадчык, Фанарнік, мае выступіць з нязгоднымі Якавінаму пляну думкамі. Якаву Гузіку запрыкрыла, але ён стараўся адагнаць ад сябе сумніўныя думкі. Няхай пакрытыкуюць, каму хочацца, пасьля змоўкнуць. Не павінна-ж так стацца, каб той, хто яго ставіў на месца, верыў больш словам, чымсь дзелу. А гэтага дзела, як-ні-як, ужо здабыта нагэтулькі, што хопіць супроцьпаставіць безадказнай гутарцы. Той гэтаму будзе адмаўляць, каго ўжо нічым не пераканаеш. А часны...

Якаў Гузік не хацеў працягваць гутаркі на гэту тэму, калі зайшоў у заўком да Яўсея. Ён зразу перайшоў да дзелавых пытаньняў. І, пэўна, за гэтым на Яўсея зрабіла моцнае ўражаньне поведамленьне Якава Гузіка аб узяцьці новага заказу на плугі.

— Справа пасуваецца,—не сьцярпеў Яўсей.

— Іначай не павінна і быць,—упэўніў Якаў Гузік.

І каб хто яго бачыў у момант выйсьця ад Яўсея,—заўважыў-бы, што ў Якава Гузіка пэўнасьць не ў адных словах. Яна кіравала яго роўным, цьвёрдым ступам, напружаным поглядам вачэй, парыўнымі рухамі рук. Якавіна постаць выглядала стальлю, ад якое адскочыць і шрот. Гэту асаблівасьць адчувалі, вядома, і тыя, хто зьбіраўся яго абстрэльваць. І дзякуючы гэтаму, нейкай надзвычайна выразнай асобаю выдзяляўся ў гэты дзень Якаў Гузік на фоне разьюшанага процэсу работы... Молат у руках здаравеннага Палікара Скрынкі пры падыходзе Якава ападаў на чырвоную паласу жалеза куды мякчэй звычайнага. А рука Самуся рухлівей падлягела да казырка шапкі. На яго твары нельга было прыме ціць і каліва нядбайнасьці. Але што таілася ў Палікаравым ды ў Самусёвым нутры—цяжка было адгадаць. Усё-ж Якаў Гузік не ўтаіў гардлівага пачуцьця, калі ўгледзеў шчыльна прычыненыя вароты і падмецены

двор. Як-ні-як, а яго ўплыў мае месца. „Па рабоце—няхай што-хоць, але за працаю ня можа быць вышэйшых ад яе інтарэсаў. Ці-ж трэба ў гэтым каго пераконваць?"

Гэтыя думкі ён выразна падкрэсьліць на вытворчай нарадзе. Можа каму і не спадабаецца—што-ж парадзіш? Гэткі ўжо закон працоўнае культуры... Той, хто ўпарта не згаджацьмецца з яе вымаганьнямі, няхай зоймецца „крыцьцём"... „Ды цікава, за вошта ўсё-ткі мерацца мяне крыць? Няўжо двухтыднёвая служба намесьнікам ужо кальнула каму-кольвечы ў вочы? А мо' я застаранна ўзяўся праводзіць дысцыпліну? Ці, наогул, занадта пільнай зьяўляецца мая гаспадарнасьць? Цікава!"

Якаў Гузік павольна ўхмыльнуўся, думаючы аб заўтрашнім. Што-б яно вызначала? Аднак, ён ніяк не чакаў таго, што паднесла яму жонка, стрэўшы яго на парозе.

— Вось, маеш,—казала яна:—ты быў праў...

— У чым?—зьдзівіўся Якаў Гузік, вытарашчыўшы вочы на жонку.—Аб чым рэч?

— Ужо ты стаеш лішнім з тваім намесьніцтвам. Толькі з поўгадзіны таму, як Сымон Кошык ліў на цябе памыі і грозіў скорпіёнамі... „Мы,—кажа,—яго ўвядом у рамкі. Гаспадар знайшоўся! Рэформатар! Ён у нас не разгоніцца... Машынка закручана, глядзі... На нашым баку і Фанарнік, і заўком... А ты,—кажа мне і пальцам ківае,—не ганарыся так сваім станам—ня надоўга... Мы яму рыхтуем такога..."

— Што ты кажаш?—уняверыўся Якаў Гузік.

— Увесь двор, кажу табе, зьбегся... Такое прыстаўленьне, што, ведаеш, гэтак прыкра, гэтак...

Якаў Гузік матнуў неахайна рукою, але балюча скрыгануў зубамі „Значыць, яно не здарма,—падумаў ён, адышоўшыся к вакну:—значыць, я мяшаю".

Перад ім паважнаю хадою папаўзла стужка чатырнаццаці дзён яго намесьніцтва. Выпадак за выпадкам, здарэньне за здарэньнем малявалі яму вобраз натужнай клапатлівасьці ў гаспадараньні над заводам. Кожны крок, маленькі паварот, усякі рух, кожнае выказанае слова, нават погляд ваччу—ён праверыў, перабраў, пракрытыкаваў. І—нічога! Нічога гэткага, каб хоць за вошта можна было зачапіцца, не знайшоў. Якія былі заўвагі—усе яны мелі характар таварыскіх гутарак; нават не насілі выгляду заўваг, а больш схіляліся на параду або і на просьбу. Ніводнага ўзыску не зрабіў, намёку ня даў на гэта, хоць даныя настойна таго вымагалі... Тут ужо ён уступіў сваім намерам, сваёй тактыцы і цьвёрдасьці дысцыплінарных вымаганьняў. І, здаецца, усё абыходзілася ціха, спакойліва. Праца заўважна папоўнілася ўнёсам у яе пачуцьця шчырасьці. Гэтак мэрам-бы рыпеўшыя, сьвісьцеўшыя варштаты—падмазаліся алеем і рушылі мяккім, плаўкім бегам... А тымчасам...

Блыснуўшы перад ім вобраз Сымона Кошыка адцягнуў зашмаргу задумаў. Якаў Гузік бачыў ускудлачаны доўгі хвост Сымонавай непашаны да работы. Каму, як ня Сымону Кошыку, абвяшчаў Фанарнік публічныя выгавары: за спазьненьні на працу, за паломку варштату, за п'янства, нарэшце... Колькі разоў бараніў яго перад адміністрацыяй прэдзаўкомам Яўсей? Па сваёй дабраце, Яўсей браўся выправіць Сымона... І каб узяў да апытаў усіх рабочых, няведама, ці хоць каторы быў-бы на Сымонавым баку... Ну, але-ж... Сымон Кошык паўстае на яго, Якава Гузіка, і грозіць, грозіць... Якое ён мае права на гэта?

Мімавольна аднялася ад падлогі Якавіна нага і грузна апусьцілася назад: па пакоі пранёсься гулкі стук.

— Што з табою?—запытала Якава жонка.

— Нічога, давай абедаць...

VII

Вялікая, прыбраная ў плякаты і портрэты саля заводзкага клюбу ўжо гадзіну ўпускала ў сябе рабочых. Яны сьцякаліся ў яе непарыўным касьнікам. Усё большы лік чорных палосак украпляўся ў белыя рады доўгіх лавак. Часьцей мятусілася чырвоная заслона над нелапою сцэнаю. Выразнымі буйнымі літарамі зазывалі аншлагі: „Павялічвай вытворчасьць працы!" „Паднімай якасьць продукцыі!". На сьценах, адзін перад другім, павярнуўшыся тварам да лёзунгаў, віселі ў рамках Ленін і Сталін. У іх сабраным у адну кропку поглядзе гарэў прызыў да ўпартага, стараннага будаўніцтва Савецкае краіны... Ніводзін з тых, хто пераступаў парог клюбу, не абмінаў кінуць узрокам на правадыроў рэволюцыі. Кожны, таксама, прачытваў надпісы. Але дапамінак, які яны давалі, тут-жа тануў у рэзвых спрэчках аб іншых пытаньнях. У напушчаным ад цыгар дыму бляднела выразнасьць літараў і разьбягаўся іх сэнс. Адчувалася агульнае хаценьне—хутчэй пачаць нараду. Руплівыя бегалі на сцэну, вярталіся назад, штосьці паведамлялі другім... Ужо мінула гадзіна пасьля прыўрочанага часу, а паседжаньне не адчынялася. Якаў Гузік усякся думаў аб прычынах гэтага. Ён чула прыслухоўваўся да кожнага слова, якое гучэла каля яго. Яму здавалася, нібы многіх увага зьвернута ў яго бок. Прынамсі, ён падмеціў гэта ня раз. Вунь, справа ад яго, у кутку, Палікар Скрынка згуртаваў грамадку з некалькіх чалавек. Стаіць гоман, рогат, ідзе аглядка ў бакі. А воньдзе дырыгуе рукамі перад трыма рабочымі Сымон Кошык... Ня цяжка здагадацца, што гэта рэпэтыцыя перадстаячых выступленьняў. Напэўна... Трэба мець навоку, іначай...

Але ў Якава Гузіка сабрана досыць пораху, каб адстрэліцца па ўсіх бакох. Ён падгатаваўся да ўсякіх нечаканасьцяй. Няведама, як далей, а пакуль у яго слабага месца няма. Няма—ён выпрабаваў сябе, праверыў... Вось няхай адно...

Якаў Гузік намераўся яшчэ раз прааналізаваць сваю нядоўгую працу і паводзіны, свой пабудаваны на наступнае плян, але быў спынены датыкненьнем чыесьці рукі.

— Гатуешся?—запытаў падышоўшы.

— Ах, гэта ты, Лазар?—адказаў Якаў Гузік:—Я гатовы!—дадаў ён.

Лазар, майстар сьлясарнага цэху, сярэдняга росту мужчына, блёндын, з мілавідным тварам, прысеў побач Якава Гузіка.

— Гатуйся, а то будуць крыць! Цэлая шайка сабралася...

— Завошта, цікава, скажы мне?—запытаў Якаў Гузік.

— Або я ведаю... або хто ведае... або яны самі ведаюць?..—паціснуў плячыма Лазар.—У многіх-жа так, дзе ўпускаюць рукі ці розум, там выручае язык... Не здарма-ж кажуць, што язык без касьцей... Так і гэта...

Лазар нахіліўся да Якава Гузіка, каб казаць яму далей, але раптоўны званок яго перабіў.

Калі яны з Якавам падняді вочы, шарганулі вяроўкі і заслона агаліла сцэну. Усе мігам змоўклі, гледзячы на пастаўлены сярод сцэны столік, за якім стаяў Яўсей.

— Прашу супакоіцца,—праказаў ён, і яшчэ раз пазваніў. У салі зрабілася зусім ціха.

— Каб весьці наш сход, трэба выбраць прэзыдыум. Каго?—падаў

Ён адчуваў, што яго прамова мае значны ўплыў на рабочых і акрэсьлівае іх пэўны настрой. Апошні наўрад ці спрыяцьме яго няпрыхільнікам!.. Ужо відаць—гэта...

Захоплены прамоваю, Якаў Гузік не пачуў, як Яўсей падаў папераджальны званок. Тады бліжэйшы да яго, рагавы сябра прэзыдыуму, тузануў яго за рукаў.

— Ужо тэрмін?—запытаў Якаў Гузік у Яўсея, перарваўшы казаньне.

— Акурат, нават пяць хвілін болей...

— Дык я канчаю...—абярнуўся ён да салі.—Значыць, перақазваю, нам патрэбны, паперш усяго, старанныя, уважлівыя, дбайныя адносіны да працы. Гэта асноўнае. Бяз гэтага немагчыма наладзіць ніводнага прадпрыемства, бяз гэтага нельга чакаць разьвіцьця прамысловасьці, нельга пабудаваць соцыялізму. Бяз гэтага не разаўецца і наш завод. Глядзець на справу, як на чужую, адносіцца да яе, як да казёншчыны—гэта самы большы вораг соцыялістычнага будаўніцтва.

Сказаўшы гэта, Якаў Гузік павярнуў к сталу. За ім панясьліся гучныя воплескі.

— Хто мае запытаньні?—пераняў іх Яўсей выкрыкам да сходу:—падавайце на запісках... А таварыш Гузік,—абярнуўся ён да Якава,—зараз адкажа?

— Ці ня было-б лепей злучыць у адно і адказы на запытаньні і